ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 165 (1132) НЯДЗЕЛЯ, 20-га ліпеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Двухтыднёвы заработак—краіне у пазыку

Тысячы пралетараў ужо сталі падпісчыкамі на пазыку „Пяцігодка—у 4 гады“

Скончыць падпіску да 1-га кастрычніка

Наркомфін Саюзу ССР выдаў пастанову, у якой абавязаў усе фінансавыя і крэдытныя ўстановы канаць усе плянавыя заданьні ў радох да 1-га кастрычніка, і ў ьскіх мясцовасьцях—да 1-га лістапада 1930 года. Пры разьмеркаваньні пазыкі ні ў якім разе не вінны быць дапушчаны скажэньні і перагібы, якія калі-некалі мелі сца пры рэалізацыі 3-ае пазыкі дустрыялізацыі.

Разьмяшчэньне пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады“ павінна вытварацца на пачатках добраахвотнасьці ў парадку шырокай грамадзка-палітычнай кампаніі.

Наркомфін абавязаў усе фінансавыя і крэдытныя ўстановы пры абмене аблігацый 1-га і 2-га займаў індустрыялізацыі і пазыкі ўмацаваньня сельскай гаспадаркі на аблігацыі пазыкі—„Пяцігодка—ў чатыры годы“ зрабіць праверку абменьваемых аблігацый з тым, каб выпадкова ня былі абменены выйгрышныя аблігацыі.

1-ы тыраж пазыкі

Першы тыраж пазыкі „Пяцігодка у чатыры гады“, адбудзецца 15-га лютага 1931 году. У тыражы будзе разыграна па бяспроцантнаму выпуску 5.810 выйгрышаў у кожным разрадзе, агульная сума выйгрышаў бяспроцантнага выпуску раўна 1.187.600 рублёў, па процантнаму выпуску ў першым тыражы будзе разыграна ў кожным разрадзе 2.460 выйгрышаў на суму 514800 рублёў.

За 10 год 38 тыражоў

Пазыка „Пяцігодка ў чатыры гады“ выпускаецца на ўмовах цалкам паўтараючых умовы трэцяй пазыкі індустрыялізацыі. Агульная прыбытковасьць пазыкі складае 10 проц. у год. У першыя гады па процантнаму выпуску адзін выйгрыш у сярэднім падае на 400 аблігацый, а па бяспроцантнаму—на 170. Цэлая аблігацыя новай пазыкі выпускаецца ў 50 рублёў. Дзялімыя аблігацыі выпускаюцца каштоўнасьцю ў 25 і 5 рублёў.

На працягу 10 год па пазыцы „Пяцігодка—ў чатыры гады“ будзе праведзена 38 тыражоў выйгрышаў па кожнаму выпуску пазыкі — процантнаму і бяспроцантнаму, штогод будзе зроблена па чатыры тыражы.

З вялікім посьпехам

НІЖНІ-НОЎГАРАД, 18. Падпіска на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады“ ахапіла ўсе заводы і ўстановы Ніжняга.

* * *

ЛЕНІНГРАД, 18. Рэалізацыя пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады“, на ленінградзкіх прадпрыемствах праходзіць пасьпяхова. Нарвэскі раён выканаў ужо 27 проц. заданьня, Маскоўскі—22 пр., Васіле-Астроўскі—21 пр., Выбаргскі—20 пр., Смольнінскі—14 пр., Валадарскі—12 пр., Петраградзкі — 20 пр. і Гарадзкі—8 пр. Завод „Электросіла“ сваё заданьне ўжо выканаў. На 18 ліпеня ў 37 аддзяленьнях 81 проц. рабочых даў у пазыку дзяржаве 132 пр. сваёй двухтыднёвай зарплаты.

Нямеччына перажывае сур'ёзны экономічны крызіс

У Рурскай горнай прамысловасьці ў пачатку 30 году зволена 40 тысяч гарнякоў

БЭРЛІН, 18. Апублікаваныя вынікі аб продукцыі жалезаробчай і каменнавугольнай прамысловасьці за першую палавіну 1930 года сьведчаць аб сур'ёзных разьмерах эканамічнага крызысу ў Нямеччыне. Так, у Рурскай горнай прамысловасьці спачатку 1930 г. звольнена 40 тысяч гарнякоў. Здабыча вугалю ў першыя 6 месяцаў 30 году складала толькі 3 проц. агульнага збыту і панізілася на 14,7 проц. у параўнаньні са здабычай у мінулым годзе. Уся продукцыя ў нямецкіх сталяліцейных прадпрыемствах у першых паўгодзьдзі 30 году зьнізілася ў параўнаньні з продукцыяй у мінулым годзе на 20,93 проц.

З Мароко

Крывавая сутычка паўстанцаў з поліцыяй у Рапаце

ПАРЫЖ, 16. Па паведамленьнях Гаваса з Рапату (у францускім Мароко) паліцэйскія пасты і павятовыя сілы зрабілі контратаку на атрад паўстанцаў, якія зрабілі налёт па адно з „сатаварыскіх французам“ плямён. Паўстанцы панесьлі цяжкія страты. У часе опэрацыі адзін афіцэр і адзін унтэр-афіцэр і адзін салдат забіты. Таксама забіта і ранена 11 туземных салдат. У раёне Тэфілалэт францускія паліцэйскія сілы таксама адбілі напад атрада, які імкнуўся перайсьці Алжырскую граніцу.

Поліцэйскія наскокі на памяшканьні камітэтаў комуністычнай партыі

НЬЮ-ЁРК. — У Монрэалі (Канада) поліцыя зрабіла наскок на памяшканьне мясцовага камітэту комуністычнай партыі, а таксама на памяшканьне рэволюцыйнага профсаюзу швэйнікаў. У часе наскоку поліцыя захапіла перапіску. У Торонто поліцыя напала на памяшканьне камітэту комуністычнай партыі і конфіскавала ўсю літаратуру, якая там знаходзілася. У Монрэалі арыштаваны Вільямс Хікс за тое, што ён прывітаў на публічных выступленьнях рэволюцыю ў Індыі. Хіксу пагражае 20 год турэмнага зьняволеньня, з тае прычыны, што ён абвінавачваецца ў патураньні да мяцежу".

Дэмонстрацыі пратэсту

супроць арышту 2 членаў нацыянальнага кongрэсу

ЛЁНДАН, Бамбейская поліцыя арыштавала двух жанчын членаў нацыянальнага конгрэсу (якія удзельнічалі ў выданьні нелегальнага бюлетэню нацыянальнага конгрэсу). Зараз-жа ў горадзе організаваліся дэмонстрацыі протэсту. Поліцыя ўзброеная дубінкамі напала на дэманстрантаў. Адбылася бойка, у выніку якой паранена 14 чалавек.

Памяці Ф. Э. Дзяржынскага

Вельмі просты чалавек

20-га ліпеня 1926 году памёр палкі змагар рэволюцыі—Фэлікс Эдмундавіч Дзяржынскі.

У яго твары партыя, рабочая кляса і ўсе працоўныя Савецкага Саюзу і ўсяго сьвету страцілі лепшага з сталёвай кагорты бальшавікоў, які нязьменна стаяў на абароне генэральнай лініі партыі, не шкадуючы сіл і жыцьця, змагаўшагася за партыю з троцкісцымі.



Усё жыцьцё тав. Дзяржынскага было ахвяравана барацьбе за перамогу пролетарскай рэволюцыі ва ўсім сьвеце. На франтох грамадзянскай вайны, у ВЧК, у ВСНГ і Наркомшляху тав. Дзяржынскі паказываў сабою прыклад бальшавіцкай работы па адпору ворага і па паднясцьцю нашай гаспадаркі. За гэта яго ненавідзелі ворагі рэволюцыі. За гэта яго любіла рабочая кляса ўсяго сьвету. Яго асабістыя якасьці дапаўнялі фігуру рэволюцыянэра-барацьбіта.

„В этом кресле очень простом,
Очень простой человек“.—

— Сказаў поэта, характарызуючы т. Дзяржынскага.

Злучэньне сталёвай цьвёрдасьці бальшавіка з чуткім сэрцам таварыша—вось асаблівыя рысы палкага Фэлікса.

З любоўю ён браў пад сваё прыкрыцьцё бяспрытульных, стварыў калёнію, дзе выхоўваюцца зараз сотні „дзяцей вуліцы“, дзе імі набываюцца працоўныя навыкі.

Жыцьцё Ф. Э. абарвалася. Ён згарэў у барацьбе з троцкістымі, у барацьбе за генэральную лінію партыі. Усяго сябе, усё сваё жыцьцё аддаўшы партыі, Фэлікс Дзяржынскі памёр на баявом пасту.

У сваёй апошняй прамове на пленуме Цэнтральнага камітэту партыі тав. Дзяржынскі казаў:

— Вы ведаеце добра, мая сіла заключаецца ў чым? Я не шкадую сябе, тав. Каменеў, ніколі. І таму, вы тут, усе мяне любіце, таму што вы мне верыце. Я ніколі ня крыўлю сваёй душой; калі я што бачу, што ў нас непарадкі, я з усёй сілай абрушваюся на іх".

Фэлікс Дзяржынскі не шкадаваў сябе і не шкадуючы сябе змагаўся з ворагамі партыі, з ворагамі рэволюцыі.

Памяць аб ім, аб лепшым бальшавіку будзе жыць сярод пролетарыяту Савецкага Саюзу і ўсяго сьвету.

Падрыхтоўка да міжнароднага пролетарскага дзіцячага зьлёту

Заклік ЦК УсеЛКСМ да комсамольскіх організацый

МАСКВА, 18. ЦК УсеКЛСМ зьвярнуўся да ўсіх комсамольскіх організацый неадкладна організаваць кампанію протэсту супроць недапушчэньня дэлегацыі юных піонэраў на міжнародны зьлёт пролетарскіх дзяцей.

З усіх канцоў на зьлёт прыбываюць замежныя дэлегацыі

БЭРЛІН, 16. Па ўсіх раёнах Нямеччыны пасьпяхова праходзіць падрыхтоўка да міжнароднага пролетарскага дзіцячага зьлёту. У гарадох і мястэчках адбываюцца сходы рэволюцыйных дзіцячых організацый, на якіх прымаюцца рашэньні аб удзеле ў зьлёце. Саюз чырвоных жанчын пастанавіў пасланць на зьлёт 300 дзяцей мальтаўскіх рабочых. Штаб зьлёту пастанавіў выцягнуць да ўдзелу ў зьлёце дзяцей загінуўшых гарнякоў у Альсдорфе і ўтрымоўваць іх на зьлёце на свой кошт.

БЭРЛІН, 18. Для ўдзелу ў міжнародным зьлёце юных піянэраў пачынаюць прыбываць замежныя дэлегацыі. У Бэрлін—пяшком прыйшлі чэскія комсамольцы з Прагі. З Бэльгіі, Нарвэгі, Голяндыі і Даніі прыехалі піянэрскія дэлегацыі. Буржуазны друк патрабуе забараненьня зьлёту.



16 ліпеня ў Дзіцячым Тэатры адбыўся мітынг-провады дэлегацыі піонэраў СССР на міжнародны зьлёт пролетарскіх дзяцей у Бэрліне. На мітынгу высьветлілася, што нямецкі ўрад адказаў у візе на ўезд у Нямеччыну нашай дэлегацыі. Мітынг-провады ператварыліся ў мітынг пратэсту.

На здымку: Выступленьне старшыні Цэнтральнага Бюро Юных Піонэраў тав. Север'янавай.

Новыя перамогі гэроічнай кітайскай чырвонай арміі

„Прэч Гоміндан, абараняйце СССР“

ШАНХАЙ. Атрад гэроічнай кітайскай чырв. арміі ў складзе 5 тысяч байцоў заняў павет Люян (провінцыя Хунань). Савецкі ўрад пераехаў зараз у павятовы горад. Люян ператвараецца ў базу, адкуль партызанскія атрады павядуць наступленьне на галоўны горад Хунаньскай провінцыі Чанша. У ваколіцах Чанша ўзмацніўся ўплыў падпольных комуністычных організацый Чанша абвешчана на вайсковым становішчы.

У павеце Гундэ організоўваюцца рэвэнныя сялянскія саюзы, у якіх налічваецца некалькі тысяч сялян. Саюзы маюць свае ячэйкі па ўсіх вёсках. У распараджэньні саюзаў ёсьць шмат зброі. Па вёсках павету расклеяны лістоўкі з лёзунгамі: „Прэч Гоміндан!“ Абараняйце СССР! Абараняйце сялянскія саюзы, зьнішчайце растаўшчыкоў і абшарнікаў.

Крытычнае становішча тэкстыльнай прамысловасьці ў Бамбеі

ЛЁНДАН, 13. Рэйтэр паведамляе аб крытычным становішчы тэкстыльнай прамысловасьці ў Бомбеі. Тры фабрыкі не працуюць ужо на працягу трох месяцаў і чакаецца зачыненьне яшчэ трох фабрык. Па словах Рэйтэра, такое катастрафічнае становішча назіраецца ва ўсёй прамысловасьці. Бомбейскія прадпрыемцы сьцьвярджаюць, што калі становішча не палепшыцца ў бліжэйшы час, дык палавіна ўсіх фабрык у Бомбеі зачыніцца.

Уборка пад пагрозай зрыву

Віцебскі АК КП(б)Б і ЛКСМБ, за вамі слова!

м. ГАРАДОК, (па тэлеграфу). Колгасам у раёне не адведзена сенажаць і папарны клін. Райустановы бязьдзейнічаюць у правядзеньні гэтай работы. Уборачная і асеньняя сяўбная кампанія пад поўнай пагрозай зрыву.

Брыгадзір „Ч. З.“ М.

Парфен Сьцяпанавіч вышаў з цярпеньня

Ёсьць людзі „трэцяга“ сорту, для іх уласьціва бяспрынцыповасьць, абыякавасьць, у іх заўсёды выпірае на першы плян уласнае „я“ і меркаю ўсяго акаляючага зьяўляецца сваё благапалучча, свая скура. Ім уласьціва, ня бачыць пэрспэктывы, яны прыстасоўваюцца да „цячэньня“, як сьлімакі да капусных лістоў.

З надворнага выгляду гэтыя людзі як-бы „апалітычныя“, але далёка ня так, іх „нэйтралітэт“, „лояльнасьцьць“ заўсёды служаць варожаму лягеру хоць яны і „расьпінаюцца“ у пэўны час за „рэволюцыю“, за „савецкую ўладу“.

Але-ж гэта фальш і робіцца яна тады, калі для іх выгодна. А ў зручны момант яны за хвіліну свайго благапалучча гатовы прамяняць рэволюцыю.

Процэсы клясавай барацьбы, выклікаюць разлагаючыя процэсы сярод гэтых людзей. Адны з іх пераходзяць контр-рэволюцыйныя чуткі супроць социялістычных форм гаспадаркі.

Барацьба за прыкладную пастаноўку працы ў комуне ёсьць адзін з стыкаў клясавай барацьбы і іменна тут на гэтым стыку ў клясавай барацьбе, у перамозе цяжкасьцей на шляху наступленьня, правяраецца бальшавіцкая ўстойлівасьць і аддаласьць рэволюцыі кожнага комсамольца

І вось тут-та ў рашаючых баёх выяўляюць свой твар фальшывыя комсамольцы „мэханічныя грамадзяне“, якія прыкрыліся комсамольскім білетам. Вось тут-та і здарылася „няшчасьце“ з Парфенам Сьцяпанавічам.

Замест таго, каб змагацца з цяжкасьцямі разам з усёй комсамольскай ячэйкай, паганая рука Парфена Сьцяпанавіча на кавалачку паперы вывела дзесяткі два слоў.

„Па сьвінаводзтву няма вучоту, парасяты яшчэ не заведзены ў прыбытак на 3-4 месяцы і зьяўляючыся рахукводам і сэкратаром ячэйкі Л. СМБ немагчыма знайсьці канцоў і я вышаў з цярпеньня, вышаў з комсамолу і комуны“.



на пункт гледжаньня пролетарыяту і заяўляюць сваю згоду змагацца разам з ім, другія падымаюць голас „протэсту“ супроць пролетарскіх наступленьняў і пераходзяць у варожы лягер.

Такіх людзей, якія „выпадкова“ сталі „савецкімі падданымі“ Максім Горкі назваў „мэханічнымі грамадзянамі СССР і ў адказ на іх паклёпніцкія лісты, адрасаваныя на яго імя, супроць савецкага ладу 7-га кастрычніка 1928 году ў № 234 „Правды“ пісаў: — „Цяпер „мэханічныя грамадзяне“ раздражаюцца не „наколькі“ як гэта было раней, калі на кожнае раздражэньне ашуканскі многім з іх давала уяўляць сябе народалюбцамі і рэволюцыянэрамі,—цяпер раздражэньне пранікла глыбока ў „тайнае тайных“ абывацельскай душы, выклікала там процэс акісьленьня, тленьня“.

Вось такое акісьленьне ня толькі душы, але і мазгоў пад уплывам варожых веяньняў нядаўна здбылося ў сэкратара комсамольскай ячэйкі комуны імя Сталін, Сьмілавіцкага раёну Песенько Парфена Сьцяпанавіча.

У комуну ён пашоў у 1926 годзе „жыцьцё загадала пакінуць сваю гаспадарку і пайсьці будаваць новую—буйную“,—так піша ён у сваім „завешчаньні“.

Кулакі і клясава варожыя элемэнты „аблізваюцца“ кожным малейшым промахам у комуне. Усякую малейшую непаладку яны сустракаюць гучнымі воплескамі і яхідным сьмехам, каб скомпрамантаваць комуну, каб утварыць яе выбух, а потым рагатаць істэрычным рогатам, сеяць

Вось тут і раскрыўся політычны твар „вышаўшага з цярпеньня“ ўчора яшчэ комсамольскага сэкратара, які сёньня кінуў комсамольскі білет і дызэртырстваваў з важнейшага вучастку клясавай барацьбы. І перайшоў на той бок барыкад.

Даўно трэба было-б паказаць свой фальшывы твар Парфену Сьцяпанавічу, шкода толькі, што білет Ленінскага Саюзу Моладзі папаў у кішэню паганцу, замаскаванаму здрадніку, які насіў яго амаль тры гады і ў „зручную“ хвіліну (а для нас у найадказьнейшы момант) з-за таго, што „па сьвінаводзтву няма вучоту“, „вышаў з цярпеньня, вышаў з комсамолу і комуны“.

І тут распаясаўся, вылушчыўся найяскравейшым чынам здрадніцкі твар Парфена Сьцяпанавіча. А як бы здарылася з ім на фронце, калі ў патрэбны момант, прышлося-б з вінтоўкай адбіваць напады працiўніка?—відаць таксама. Тут ён кінуў білет і дызэртырстваваў, вышаўшы з комуны, там-бы кінуў-бы вінтоўку і дызэртырстваваў-бы з фронту, альбо аддаўся ў рукі ворага. Як-жа яго акісьлёныя ад варожага ўгару мазгі „вынайдуць“ адказ на гэта пытаньне?..а яго бязумоўна паставяць перад ім комунары і комсамольцы.

Мікола Жартны.

Плян правядзеньня „Міжнароднага Чырвонага Дня 1-га жніўня“

Правядзеньне кампаніі Міжнароднага Чырвонага Дня ставіць перад усімі грамадзкімі арганізацыямі наступныя палітычныя задачы:

1. Давядзеньне да працоўных мас дасягненьняў і посьпехаў пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва СССР у сьвятле рашэньняў XVI зьезду УсеКП(б) і мабілізацыя актыўнасьці мас на выкананьне прамфінпляну, рэалізацыя пазыкі „Пяцігодка—за чатыры гады“, калектывізацыя, хлебазаготоўчая кампанія, асеньняя сяўба, уборачная кампанія і інш.

2. Шырокае асьвятленьне працоўным масам гораду і вёскі небясьпекі імпэрыялістычнай вайны і асабліва небясьпекі контр-рэвалюцыйнай вайны супроць СССР з боку міжнароднага імпэрыялізму з завастрэньнем увагі на практычных задачах узмацненьня абароназдольнасьці нашага краю.

3. Шырокае растлумачэньне працоўным масам важнасьці і значэньня сацыялістычнага будаўніцтва СССР з пункту погляду задач сусьветнай рэвалюцыі і ролі інтэрнацыянальнай пралетарскай салідарнасьці ў абароне СССР ад ваенных авантур імпэрыялізму.

4. Шырокая папулярызацыя ў масах значэньня надыходзячага 10-гадовага юбілею Прафінтэрну і ролі Прафінтэрну ў сучаснай клясавай барацьбе.

Зыходзячы з гэтага, вызначыць наступныя мерапрыемствы па правядзеньні „Міжнароднага Чырвонага Дня“:

а) Усім цэнтральным, акруговым насьценгазэтам і шматтыражкам неадкладна разгарнуць работу па падрыхтоўцы і правядзеньні кампаніі пад лёзунгам: „рыхтуйцеся да Міжнароднага Чырвонага Дня“;

б) Ва ўсёй палітмасавай працы, якая будзе праводзіцца грамадзкімі арганізацыямі на працягу бліжэйшых тыдняў, асьвятляць задачы Міжнароднага Чырвонага Дня;

в) Мабілізаваць актыў усіх грамадзкіх арганізацый (прафсаюзаў, МОПР'у, Асоавіяхіму, камсамолу, культэмычкі і г. д.) для пасьпяховага правядзеньня кампаніі як у горадзе, так і на вёсцы;

г) Правесьці масавую праверку і самаправерку дзейнасьці нізавых ячэек Асоавіяхіму ў галіне ваенізацыі працоўных шляхам складаньня брыгад на фабрыках, заводах, установах, у раёнах, саўгасах, калгасах;

д) У дзень 1 жніўня правесьці ў садох, клюбах, фабрыках, заводах, саўгасах, калгасах і вёсках масавыя мітынгі супроць падрыхтоўкі імпэрыялістычных войн і, у першую чаргу, супроць падрыхтоўкі ваеннага нападу на СССР з боку міжнароднага капіталізму.

Рана яшчэ адмаўляцца ад бронь-вучнёўства

По шэрагу прадпрыемстваў бронь-падлеткаў не навучаюць, а выкарыстоўваюць на чорнай рабоце

Неадкладна праверыць, як організована індывідуальнае вучнёўства на прадпрыемствах

Паводле рашэньняў ЦК УсеЛКСМ і ЛКСМБ асноўнай крыніцай задавальненьня вытворчасьці кваліфікаванымі кадрамі павінны зьявіцца ФЗВ, але-ж на бліжэйшы час нельга адмаўляцца і ад магчымасьці падрыхтоўкі рабочых кадраў унутры прадпрыемстваў, адным з форм якога зьяўляецца індывідуальнае і брыгаднае вучнёўства бронь-падлеткаў.

Але зьмяшчаемы сёньня матар'ял сьведчыць аб тым, што ня ўсе гаспадарчыя, профсаюзныя і комсамольскія організацыі гэта так зразумелі.

Друкуемы матар'ял дае яскравы малюнак, як паасобныя гаспадарнікі замест паляпшэньня працы—организацыі індывідуальнага вучнёўства зрываюць яго, выкарыстоўваючы бронь-падлеткаў на чорнай працы, нават не абмяжоўваючыся шасьцігадзінным працоўным днём, а профсаюзныя і комсамольскія организацы, ніякіх мер барацьбы супроць гэтых бясчынстваў ня прымаюць.

Мала гэтага, нават не праведзена прыцаваньне бронь вучняў да паасобных майст… і не ўтвараецца праверка ходу працы па вучаньню бронь-вучняў. Факты з Фанэр… заводу з усёй яскравасьцю сьведчаць … тым, што комсамольская ячэйка і проф… не праводзяць ніякай працы і сярод майст… у напрамку наладжваньня правільных узае… адносін паміж майстраў і вучняў.

Майстры не пераканалі ў сябе старыя … дыцыі да вучняў і яшчэ і зараз патрабу… ад вучняў хабароў у выглядзе „рускай … кай“, а калі не дасі, значыцца, ня будзеш вучаны.

Можна прывесьці яшчэ цэлы шэраг а… гічных фактаў бясчынных адносін да ву… ства на прадпрыемствах. Усё гэта ставіць … рад комсамольскімі ячэйкамі прадпрыемс… як адну з задач арганізаваць праверку с… вішча індывідуальнага вучнёўства.

Бронь-вучань—пасынак на „Беларускы“

У колумове Менскай фабрыкі „Беларуска“ ёсьць пункт аб паляпшэньні працы бронь-вучнёўства і прасоўваньня іх на вышэйшыя кваліфікаваныя работы. Як-жа выконваюцца гаспадарчымі і профсаюзнымі органамі імі-ж ўзятыя абавязацельствы?

Бронь-вучні на фабрыцы навучаюцца без усялякай програмы, ніводзін з вучняў не прымацаваны да асобных майстраў, які-б яго навучаў і адказваў за яго навучаньне. Вучняў перакідваюць з адной працы на другую, і на чорную работу.

У гузікавым цэху бронь вучні замяняюць выхадныя дні другіх работніц. Напрыклад, бронь-вучань Тульнік—2 дні ў тыдзень працуе ў адной зьмене, а тры дні ў другой зьмене, ніхто ня вучыць яе ніякай кваліфікацыі. Нават пры замяшчэньні выхадных дзён іншых работніц, выконваючы іх работу яна не атрымоўвае зарплату па іх стаўцы

Такое-ж становішча і ў грэбенным цэху, дзе асобныя бронь-вучні на працягу нядоўгага часу пабывалі на ўсіх відах працы, пачынаючы ад закройнай і канчаючы ўпакоўкай грэбянёў.

Можна было-б прывес… яшчэ шэраг прыкладаў, сьведчаць аб тым, што б… вучні на прадпрыемстве … ляюцца пасынкамі, альбо … патрэбнымі людзьмі.

І горш за ўсё, што … з гэтымі фактамі не … ніякай барацьбы. Комса… ская ячэйка, да якой не… крацъ зьвярталіся бронь… да гэтага часу ня п… ла захаду. Нават эк… работнік адказвае—мы … ня можам вам дапамаг…

Нічога ня робяць і фа… каб скласьці нормальныя … вы працы для бронь-вучн…

Так, т. Дамброўскі, мы пагаворым!

Ахоўай працы падлеткаў на Бабруйскім камбінаце дрэваапрацоўчнікаў ніхто не займаецца. Падлеткі працуюць 7 гадзін замест 6, не карыстаюцца днямі адпачынку. Цэлы шэраг і іншых недапушчальных фактаў выявіў комсамольскі колектыў у часе правядзеньня месячніку агляду працы падлеткаў. Зараз мы раскажам яшчэ аб адным безадказным факце з боку адміністрацыі комбінату.

Высьветліўшы факты, што падлеткі не карыстаюцца месячным адпачынкам (на які яны маюць права) і 6-цігадзінным працоўным днём, колектыў прапанаваў падлеткам падаць заяву цэхавай адміністрацыі. Загадчык цэху, атрымаўшы заяву, перадаў яе для высьвятленьня загадчыку аддзелу Дамброўскаму, які замест высьвятленьня сутнасьці справы і задавальненьня законных патрабаваньняў вучняў напісаў рэзалюцыю наступнага зьместу: „Падлеткаў зьняць з працы“.

На протэст комсамольскага колектыву і яго прадстаўніка супроць такіх бясчынстваў Дамброўскі пачаў пагражаць, што ён з такім комсамольскім кіраўніцтвам „пагаворыць там, дзе патрэбна“ і г. д.

Нарэшце, трэба адзначыць, што з боку профсаюзных організацый і старшыні фабкому т. Серафімовіча падлеткі замест абароны сваіх законных патрабаваньняў атрымалі адказ— „Калі вы будзеце працаваць 6 гадзін замест сямі і адпачываць месяц замест 2-х тыдняў, дык для „рэжыму эканоміі трэба вас звольніць“.

Мы пытаемся галаваціпа Дамброўскага і Серафімовіча, дзе яны бачылі і чыталі такія дырэктывы, хто ім дазволіў тварыць такія бясчынствы над падлеткамі.

Так, т. Дамброўскі, думаем, што мы з табой пагаворым у адпаведным месцы! Завалкоў.

...Хочаш вучыцца—пастаў пару...

На фабрыцы „Везувій“ працуе каля 25 чалавек бронь-падлеткаў. Як-жа пастаўлена іх навучаньне? Факты раскажуць.

Каробачны цэх пашыраецца. Прывозяць новыя машыны, для працы на якіх патрэбны кваліфікаваныя кадры, але справай падрыхтоўкі— бронь-падлеткаў для працы на гэтых машынах, ня гледзячы на тое, што яны і прымацованы да іх, ніхто не займаецца.

Нават пры рамонце машын манцёры праганяюць вучняў, каб апошнія не навучыліся працаваць. Не даюць бронь-падлеткам больш складаных заданьняў, каб апошнія выконваючы іх змаглі атрымаць навык у працы. Бронь-падлеткаў выкарыстоўваюць у большасьці на „пабягушкі“, падмятаньне падлогі і г. д.

А калі вучні пачынаюць стойна пашукваць для сябе … не і выконваць яго, майстры … раюць інструманты і г. д.

Яшчэ горш абстаіць спра… фанэрным заводзе, дзе працуе … леткаў. Працоўны дзень для і… ноўлен 8 гадзін, замест 6. А… да апошніх з боку майстраў … недапушчальныя. Шэраг м… па-старынцы глядзяць на в… кажучы—**„Калі хочаш быць … цам—патрэбна быць ч… кам“**, так заяўляе Шыльле… рапоўскі і іншыя люб целі „… горкай“. Іншымі словамі „каж… „Хочаш навучыцца' патрэбна … віць пару, а то і больш літр… скай горкай“. Гэта не адзін… падкі, іх можна налічыць … камі.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены“

Парадак правядзеньня агляду спаборніцтва

на прадпрыемствах папяровай прамысловасьці

Усю апэрацыйную штодзённую работу па аглядзе на мясцох вядуць рэдкалегіі заводзкіх газэт, на якіх ускладаецца наступнае:

Організаваць безадкладна аглядавыя камісіі або камісіі садзейнасьці агляду з прадстаўнікоў парт'ячэяк, КСМ, ФЗМК, заводакіраўніцтва, інжынэрна-тэхнічных работнікаў і лепшых ударнікаў. На аб'яднаных нарадах рэдкалегіі ячэйкі, ФЗМК, заводакіраўніцтва і КСМ павінны быць абгавораны пляны дзейнасьці аглядавых камісій. Такія-ж нарады склікаюцца ва ўсіх цэхах і пры рэдкалегіях цэхавых газэт. Цэхавыя аглядавыя камісіі адказваюць за сваю работу перад заводзкімі камісіямі. Разам з аглядавымі камісіямі склікаюцца шырокія масавыя рабочыя сходы для азнаямленьня рабочых з задачамі і парадкам правядзеньня агляду.

Рэдкалегія і аглядавая камісія адзін раз у 10 дзён інфармуюць у пісьмовай форме аб праведзенай рабоце акруговаму, рэспубліканскаму і ўсесаюзнаму штабу агляду спаборніцтва.

Рэдкалегіі і аглядавыя камісіі праводзяць сваю работу па пляне: вытворчыя агляды асобных цэхаў або агляды па паасобных агульна-заводзкіх паказальніках (рацыяналізацыя, зьніжэньне сабекошту, прагулы, зьніжэньне браку), як найбольш … пытаньнем у даны момант.

Адной з важных частак вы… агляду зьяўляецца збор прапано… чых і інжынэрна-тэхнічнага … лу. Неабходна праз брыгады … каць максымальны прыліў … прапаноў па зьнішчэньні не… па рацыяналізацыі, удаска… працэсаў вытворчасьці, па … ніцтву і па пытаньнях капі… будаўніцтва.

Кампанію агляду-спаборніцтва … ходна зьвязаць з баявой зада… зборы папяровай макулатуры … лю, для чаго трэба зараз-жа … прадпрыемствах ствaрыць ячэй… ражэньня паперы.

Па сканчэньні ўсесаюзнага … (1 кастрычніка) цэнтральны ш… падставе матар'ялаў, якія бу… рыманы ад рэдкалегій па ход… лу, на падставе матар'ялаў бр… мога цэнтральнага штабу і на … ве вывучэньня газэтамі пра… стваў папяровай прамысловасьці … лучаюцца 20 заводзкіх і 30 … рэдкалегій для прэміяваньня.

Кожны ўпушчаны дзень—удар па ўборцы

Колгас „Чырвоны Барацьбіт“ бальшавіцкімі тэмпамі праводзіць уборачную. Комуна „Леніна“ ў хвасьце

Падвоенай работай уборачных машын зьбярэм усходы бальшавіцкай вясны

Спыні ь бязьдзейнасьць!

Уборачнай кампаніі ў Гарадоцкім раёне (Віцебшчына) пагражае зрыў. РК КП(б)Б і РВК ня прынялі ніякіх захадаў да выпраўленьня прарываў па падрыхтоўцы да ўборкі.

Колгасам да гэтага часу не абведзены сенажаці і паравыя кліны, што пагражае ўборцы і восеньняй сяўбе.

Колгасы не забясьпечаны дастатковай колькасьцю машынамі для ўборкі і жалезам для рамонту. Адчуваецца недахоп у колах. Колгасы і індывідуальны сэктар не забясьпечаны сярпамі і косамі.

Пляны ўборачнай кампаніі толькі 10-га **ліпеня вышлі з канцэлярыі райколгассаюзу.** У многіх колгасах адчуваецца недахоп рабочай і конскай сілы, а райпалыводсаюз ня даў належных дырэктыў аб замене недастаючых рук, нагрузкай машын у дзьве зьмены і г. д.

Не распрацаваны мерапрыемствы па дапамозе колгасаў індывідуальным бядняцкім гаспадаркам.

У большасьці колгасаў не пабудованы гумны для складаньня збожжа. З боку партыйных і комсамольскіх організацый не распачата ніякай растлумачальнай працы аб значэньні ўборачнай кампаніі і разьмеркаваньні ўраджаю сярод колгасьнікаў.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены“ **Лук'яновіч.**

„Чакай... мы складзем плян“...

Уборачная кампанія ў комуне „Леніна“, Гарадоцкага раёну (Віцебшчына) ужо пачалася: ідзе касьба сенажаці і канюшыны, праз 5-6 дзён пачнецца ўборка жыта.

Але „ленінцы“ ўборачную кампанію сустрэлі бяз усялякай падрыхтаванасьці. Калі нам давялося запытаць старшыню комуны, члена партыі тав. **Паўлава**, як комуна падрыхтавалася да ўборкі ўраджаю, дык ён адказаў,—**„Чакай, зараз будзе складзен плян, тады будзе відаць наша падрыхтаванасьць і ўсе зьвесткі, якія табе патрэбны, ты атрымаеш“.**

Прыехаўшыя два аграномы пачалі складаць плян уборачнай кампаніі, але хутка спынілі гэтую работу, бо старшыня ня ведаў колькі ў комуне ёсьць працаздольных мужчын і жанчын, адсутнічаюць весткі аб вучоце конскай сілы; у канцэлярыі лічацца на вучоце тыя коні, якіх ужо некалькі год няма.

Палявод **Восіпаў** (таксама партыец) ня ведае колькі, дзе і што пасеяна. Такое становішча прымусіла аграномаў замест складаньня пляна ўборачнай кампані зьбіраць зьвесткі аб гаспадарцы.

Старшыня комуны ня ведае аб становішчы рамонту сел.-гасп. машын. Па яго словах у комуне маецца 3 жаткі, з якіх працаваць будуць дзьве, а ў сапраўднасьці маецца 4.

Касаркі па словах **Паўлава** спраўны абедзьве, а на самай справе толькі **адна**.

Вакол пытаньня ўборкі не мобілізаваны масы колгасьнікаў, пытаньне ўборкі да сёнешняга дню яшчэ не разглядалася ні на паседжаньні праўленьня, ні на агульным сходзе колгасьнікаў. Плян не складзен, праца не організавана, няма куды складваць снапы.

Цяпер толькі пачалі думаць аб пабудове гумна.

У комуне маецца і ячэйка КП(б)Б, якая налічвае 8 чалавек і ячэйка ЛКСМ—29 чалавек.

Як партыйная, так і комсамольская ячэйка не стаяць на чале гаспадарчага будаўніцтва комуны.

Л-ч.

„Чырвоны Барацьбіт“—прыклад для астатніх колгасаў Камарынскага раёну

Уборачная разгортваецца ўдарнымі тэмпамі

Камарына, 15. У гэтым годзе, 38 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі **Асарэвічы** згуртаваліся ў адну сям'ю, організаваўшы самы буйны колгас у раёне **„Чырвоны Барацьбіт“**.

Колгасьнікі абралі сабе добрага кіраўніка, былога ўдзельніка грамадзянскай вайны, **старога комуністага—Плюшчая Кірылу.**

Плюшчай, будучы добрым гаспадаром, узяў справядлівы курс у сваёй працы па замацаваньню соцыялістычнай гаспадаркі. Як толькі здарыцца які небудзь прарыў на работах—Плюшчай там.

Паказвае як трэба працаваць, растлумачвае і даказвае і з ім згаджаюцца.

—Толькі дзякуючы свайму старшыні мы моцным крокам ідзем уперад, —кажуць колгасьнікі, а сам Плюшчай добра ведае, што бяз мас, бяз прыцягнутага[illegible] актыву, ён-бы нічога не зрабіў.

Зараз перад колгасьнікамі паўстала баявая вялікая задача—па ўдарнаму закончыць уборку—**500 га сенажаці, 246 га ярыны і [illegible]0 га жыта.**

Цяжкавата, але колгасьнікі сваёй адданасьцю, энтузіязмам **цяжкасьці перамагаюць.** Праца ідзе вельмі інтэнсыўна. „Асабліва добра працуе наша моладзь—на чале з комсамольцамі“—заяўляе **т. Плюшчай.**

Моладзь „Чырвонага Барацьбіта“ зразумела новае жыцьцё. **У сьвяточны** Пятроў дзень моладзь высыпала на поле і **зьвязала 60 копаў** мецю.

Жанчыны самі сябе організоўваюць. Паспрабуй адстаць ад працы, а яшчэ горш спазьніцца бяз уважлівых прычын, дык пачуеш такое грамадзкае ганьбаваньне, што больш чырванець ніколі не захочаш. Са сьпевамі, амаль па вайсковаму 70-80 жней—жанчын крочаць дамоў пасьля работы.

Тыя, якія засталіся па-за колгасам, чакаюць восені, каб уступіць у колгас.

15-га ліпеня ўсе колгасьнікі **выйшлі колектыўна жаць індывідуальна засеянае жыта.** Яны (а жанчыны тут галоўная) парамі **збагуліць жыта.**

Падрыхтаванасьць да ўборачнай і ўпэўненасьць у свае сілы, дае магчымасьць спадзявацца, што ўсё жыта будзе ўбрана своечасова. **45 чалавек за 6 дзён скасілі 165 га сенажаці** На полку **50 га сяўбы было патрачана 12 дзён замест вызначаных 20**

Ёсьць перавыкананьне нормы на жніву.

Колгас „Чырвоны Барацьбіт“ вы-

йдзе ва ўборачнай кампаніі пераможцам **над астатнімі колгасамі Камарынскага раёну.**

Больш усяго праўленьне трывожыцца за другую галіну сваёй работы—гэта пабудова аборы на **250 галоў рагатай жывёлы.**

За два месяцы 15 чалавек пабудавалі хлеў разьмерам у ¼ кілёметру.

Шмат энэргіі было патрачана на пабудову такога вялікага хлеву. Хлеў патрэбна пакрыць. Для гэтага патрэбна 197 куб. мэтраў лесу і 2400 лістоў жалеза. Усяго гэтага ў колгасе няма і бюрократы з Камарына мала клапоцяцца, каб дапамагчы колгасьнікам.

Калі не падтрымаць энтузіязм колгасьнікаў, ня даць ім жалеза, дык гэта будзе ня што іншае, як злачынства.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены“ **В.**



Рамонт жняяркі.

Камарынскія опортуністыя

зрываюць важнейшыя гаспадарча-політычныя мерапрыемствы

У Камарынскім раёне (Гомельшчына) колектывізавана 28,8 проц. усіх гаспадарак раёну і 42 проц. па яравому кліну.

Правёўшы першую бальшавіцкую сяўбу камарынская партыйна-комсамольская організацыя не зьвярнула належнай увагі на замацаваньне існуючых колгасаў. За апошнія дні дзякуючы яе непадрыхтаванасьці да ўборачнай кампаніі маюцца факты выхадаў з колгасаў. Так, напрыклад, у колгасе „Комінтэрн“ падалі заявы аб выхадзе 16 гаспадарак, у Ніжня-Жараўскім—10 і г. д.

Праўленьне райколгассаюзу фактычна ня існуе. Пачынаючы са студзеня месяца па сёньнешні дзень у іх было толькі тры паседжаньні. Абавязкі сярод сяброў праўленьня ня былі разьмеркаваны. Кіраўніцтва колгасамі адсутнічае. Старшыня райколгассаюзу **Глушакоў** у момант калі 7-га ліпеня пачалася масавая ўборка жыта і раньніх яравых, выехаў з раёну. Яго намесьнік **Касьянаў** кажа: „пляна ў уборачнай кампаніі ў колгасах няма, таму, што колгасы нашы ня ўстойлівыя,(?) сілосаваньне праводзіць ня будзем. Сталін у сваім дакладзе на XVI зьезьдзе сказаў, што паменшылася колькасьць жывёлы, а таму контрактаваць яе не патрэбна(?!)“. Цікава чаму РК КП(б)Б дапускае да такой адказнай работы чалавека, ідэолёгія і практыка якога наскрозь правоопортуністычная.

Плян уборачнай кампаніі ў раёне складзен **толькі 8 ліпеня.** Аб організацыі працы ў колгасах, аб рабоце машын, іх максымальным выкарыстаньні, аб памяшканьні для збожжа, а дапамозе індывідуальным маламоцным гаспадаркам ніхто і ня думае.

Дзяржаўныя сродкі на крэдытаваньне колгасам выдаюцца бяссыстэмна. На сёньнешні дзень колгасы атрымалі 198.000р.рознага крэдыту. Праўленцы бяруць, але колгасьнікі ня ведаюць колькі ўзята, і на што?

Трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу сыстэме крэдытаваньня колгасаў, наладзіць самы суровы кантроль над правільным скарыстаньнем крэдытаў, каб кожны колгасьнік ведаў колькі ўзята і на якія мэты, адчуваў-бы адказнасьць як за яго скарыстаньне, так і зварот.

Камарынскі раён зьяўляецца раёнам жывёлагадоўлі, кармавая база яго павінна быць пасілена сілосам, аб апошнім сур'ёзна мала хто думае. Па пляну трэба пабудаваць 10 сілосных ям на 30.000 пудоў сілосу. На сёньнешні дзень пабудавана толькі адна яма.

Пад сьвінагадоўлю вылучаны ў раёне тры колгасы, але гэтая справа вельмі дрэнна рухаецца. Так сьвінарнікі яшчэ не пабудованы, лес на будоўлю не атрыманы. Да 1-га кастрычніка трэба паставіць 800 сьвінаматак, а на сёньнешні дзень маецца толькі 59. Гэта сьведчыць аб тым, што плян сьвінагадоўлі райколгассаюзам вырашаецца па-сьвінску.

Райком партыі і райком комсамолу не пераключылі работу сваіх організацый на баявыя ўдарныя тэмпы працы, не даюць рашучага адпору праваапортуністычнай ідэолёгіі і практыкі тыпу Касьянава. Само бюро РК КП(б)Б вядзе працу бяссыстэмна. Так, напрыклад, 6-га ліпеня былі склікаьы: конфэрэнцыя груп беднаты, конфэрэнцыя рабземлесу і райнарада жаночага актыву. Зразумела, што РК КП(б)Б ня змог стала абслужыць гэтыя конфэрэнцыі і яны не змаглі даць пажаданых вынікаў.

Комсамол не праяўляе ініцыятывы ў працы. Гомельскі АК ЛКСМБ толькі 11-га ліпеня прыслаў дырэктывы аб падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі, у той час, як уборачная кампанія фактычна ўжо даўно распачалася.

Брыгадзір „Ч. З.“ **В. Воінаў.**

Парад ілжэ-спэцаў і шкоднікаў

Дакуль Белколгасбуд будзе прахадным дваром для прахадзімцаў?

Друку ня ўпяршыню прыходзіцца будзіраваць усю грамадзкасьць і ў першую чаргу дырэкцыю Белколгасбуду, патрабуючы ад яе недапушчэньня ў далейшым промахаў і ліквідацыі прарываў у рабоце. Аднак, патрабаваньне грамадзкасьці і сыгналы друку не аказалі ніякага ўзьдзейнічаньня на адміністрацыю Белколгасбуду.

Дзеля прыкладу прывядзем факты падбору працаўнікоў.

Прорабам у савгасах Тарасава-Кальварыя, працаваў гр. Сойфэр, асоба, якая ўладала зусім самніцельнай тэхнічнай падрыхтоўкай. Гэты „спэц“ атрымоўваў аклад ў 300 р. у месяц і выдаткаваўшы вялікія грошы на пад'ёмныя і пераяздныя пасьля 8 месяцаў працы звольніўся, як-раз перад тым, калі скончыліся падрыхтоўчыя работы да будаўніцтва і калі яму прышлося непасрэдна кіраваць работай па будаўніцтву.

А вось другі ня менш характэрны прыклад узяцьця на працу прахадзімца гр. Парэмбскага. Узяты на працу інжынэрам-крухмальшчыкам ён яшчэ загадзя быў вядомы Белколгасбуду, як дрэнны працаўнік. За ўвесь час працы Парэмбскі зрабіў адну невялікую работу, якую мог-бы з такім-жа посьпехам зрабіць чарцежнік-конструктар. Ды і гэта работа аказалася нягоднай. Можна прывесьці яшчэ шэраг прыкладаў рвацкіх адносін з боку Парэмбскага да Белколгасбуду. Але Парэмбскага чамусьці аслабаняюць ад работы па ўласнай просьбе, ды і Сойфэра звальняюць па тых-жа прычынах. Дзе гарантыя таму, што Парэмбскі і Сойфэр пасьля такіх звальненьняў „па асабістаму жаданьню“ ізноў будуць працягваць сваю шкодную работу ў дзяржаўнай установе. Да рэчы Парэмбскі працуе ўжо ў Белполеводсаюзе.

Старэйшым прорабам па Менскай акрузе ў якасьці інжынэра-будаўніка працуе артылерыст з адукацыяй царскай Вайсковай Акадэміі гр. **Каралёў.** Маладыя прорабы даюць яму верную характарыстыку:—„Ён сам нічога ня робіць і другім перашкаджае“. А пра гэтага спэца шмат гаварылася, але ён чамусьці ўсё-ж як і раней працуе ў Белколгасбудзе.

Якія працаўнікі,—такая і работа

Проэктаваньне тыпавога сьвінарніка даручылі інжынэру Сахараву і тэхніку Мінькову, за ўзнагароду каля 1000 рублёў. Гэтыя „савецкія“ спэцы прасядзелі чатыры ночы над проэктам, і аддалі тады сваю працу, калі атрымалі ўзнагароду. А між тым у іхнім проэкце няма ніводнага вернага разьліку, шмат вялікіх ляпсусаў, якія кажуць не аб выпадковых памылках, а аб нясур'ёзных і шкодных адносінах да справы. Інакш як шкодніцтва гэтага кваліфікаваць нельга. Зараз проэкт яшчэ ня скончаны і пераробка яго абыйдзецца ў вялікія грошы. А што было-б, калі-б гэты проэкт быў-бы прыняты. Гэта каштавала-б нязьлічоную суму грошай.

Такія факты замазваюць у Белколгасбудзе.

Затрачаныя грошы па віне Сахарава і Мінькова павінны быць зьвернуты дзяржаве. Мы патрабуем прыцягненьня іх да адказнасьці.

У тэхнічным кіраўніцтве Белколгасбуду знаходзяцца людзі, якія займаюцца дробнымі справамі, склокамі. Сыстэма асабістых драз[illegible], падачы штодзённа заяў з пагрозамі аб уходзе, маюць месца ў верхавіне тэхнічнага кіраўніцтва.

У вытворчым сэктару пануе паўнейшая неразбярыха. Справы запушчаны. На месцы пасылаюцца работнікі куды па тры чалавекі, а куды і ніводнага. Ёсьць шэраг фактаў, калі прорабы адкамандыроўваюць лішніх працаўнікоў, якія ім пасылаюцца, у той-жа час па сыстэме не хапае работнікаў. Штаты надзвычайна раздуты. На об'екты, каштоўнасьць якіх складае 150000 рублёў, маюцца прораб, тры дзесятніка, практыкант і рахункавод. Такі вялікі апарат каштуе шмат грошай. А на мясцох бяруць прыклад з начальства.

Ня бачаць таго, што робіцца ў сябе пад носам

За рабсілай пасылаюцца людзі ў Смаленск, Донбас і іншыя мясцовасьці. І гэта ў той час, калі на працы выконваемыя ў вясковай мясцовасьці маглі-б з посьпехам комплектавацца мясцовыя рабочыя сілы з колгасьнікаў і сялян беднякоў.

Проэктнае бюро вядзе сваю працу адарвана ад вытворчага сэктару. Проэктнаму бюро няма калі працаваць, бо там спрачаюцца, хто каму павінен падпарадкавацца, загадчык проэктавага бюро—тэхкіраўніку, ці наадварот. А вынік з гэтых спрэчак—надзвычайна кепская распрацоўка проэктаў. Вось нядаўна інжынэр Сасноўскі распрацаваў рабочы чэрцёж і адаслаў яго на месца бяз паказаньняў ніякіх разьмераў. З-за такой пастаноўкі працы шмат лішніх грошай выплывае з касы Белколгасбуду.

Партыйныя, комсамольскія ячэйкі, мясцком і грамадзкія організацыі ня рэагуюць на ўсе гэтыя ненормальнасьці.

Неабходна палепшыць кіраўніцтва звыш, удаскапаліць узаемаадносіны паміж сэктарамі, узяць больш сьмелы курс на вылучэньне ў кіраўнічыя органы сапраўдных чырвоных спэцыялістых, правёўшы ачыстку ад баласту перашкаджаючага працы.

РСІ павінна зацікавіцца становішчам Белколгасбуду.

4 подпісы.

Сёньня пачынаюцца спэктаклі Ленінградзкага ТРАМ'у

Рабочая моладзь, комсамольцы Менску павінны наведаць ТРАМ'аўскія спэктаклі

На сустрэчы ў Доме Комсамола

На гэтай сустрэчы ня было той казёншчыны і нацягнутасьці, пазяхваньняў і санлівасьці, якія часамі бываюць на вечарох падобнага тыпу. Пазаўчора ў Доме Комсамолу сустрэліся Ленінградзкі і Беларускі ТРАМ'ы.

У таварыскай гутарцы гаварылі аб сваім жыцьці і Беларускія ТРАМ'аўцы і госьці Ленінградцы.

Пару найбольш характэрных рысаў з гісторыі Ленінградзкага ТРАМ'у.

Старэйшы ТРАМ па Савецкаму Саюзу—Ленінградзкі, оргарізаваўся ў 1922 годзе ў доме комуністычнага выхаваньня імя Глерона. Уласна кажучы тады ня было яшчэ ТРАМ'у. Тады быў „СТРАМ"—„Студыя Рабочай Моладзі". Першыя спэктаклі праходзілі на табурэтках, паміж якімі клалі дошкі—гэта і была сцэна, і толькі праз тры гады ЛенТРАМ атрымаў „павышэньне", бо тады ўжо спэктаклі і інсцэніроўкі праводзіліся на сталох.

Часы ішлі... У процэсе вучобы ў ТРАМ'е і работы на вытворчасьці нарадз'лася першая пастаноўка „Сашка Чумовой", спэкталь выступіўшы супроць „шпаны", за яе перавыхаваньне, супроць фінкі і касьцета.

ТРАМ'аўцы непасрэдна працавалі на заводах. Яны ведалі ўсё тое, што хвалюе рабочую моладзь і ўсё перапрацоўвалі на сцэнічную форму—трамаўскія інсцэніроўкі і спэктаклі. Так нарадзіліся і аформіліся спэктаклі „Бузьлівая кагорта", „Зові фабком", так-жа нарадзіўся і шэраг іншых.

Ленінградзкаму ТРА'му былі патрэбны грошы, і першыя 500 рублёў былі зароблены на кіно-здымках. ТРАМ'аўцы ўдзень працавалі на заводах, а начымі ў працягу двух тыдняў пад струменямі сьвятла прожэктароў і накіраванымі об'ектывамі кіно-апаратаў здымаліся для кіно-карціны—білі шкло.

Колектыў ЛенТРАМ'у жыве ў бытавой комуне. Разам жывуць, разам харчуюцца, колектыўна працуюць.

Толькі такі колектыў цесна ўсімі ніцямі спаяны з рабочай моладзьдзю і комсамолам даваў дагэтуль і зможа даваць надалей бадзёрыя і моцныя спэктаклі, які хвалююць рабочую моладзь.

Рабочая моладзь Менску, комсамольцы павінны быць на спэктаклях Ленінградзкага ТРАМ'у.

Ал. Л.

Прыём броні падросткаў у ФЗВ

У Менскай школе фабзавучу МББ чыгункі адкрываецца асеньні прыём у 1-ую клясу ў колькасьці 151 чалавека.

У школу вучнёўства ў першую чаргу прымаюцца дзеці рабочых і служачых, якія скончылі школы ФЗВ. З астатніх у першую чаргу прымаюцца дзеці рабочых і выхавальнікаў дзетдамоў, дзеці інжына-тэхнічных работнікаў, зан на вытворчасьці, дзеці был. катаржан, батракоў і дзеці ка нікаў. Пры недастачы гэтых тынгентаў дзеці ніжэйшых с чых.

За нац. меншынствамі і дз тамі броніруецца ўстаноўлены цант.

Усе паступаючыя ў школу віны быць на вучоце біржы цы, у адносінах падросткаў, пр ваючых на акраіне і на лініі скаецца рэгістрацыя на працы.

Асноўная база прыёму ўст ліваецца 7-годка, але пры нед контынгента сямігоднікаў б прымацца таксама падросткі і 6-х гр... Пры падачы зая абходна прылажыць наступныя кументы: а) пасьведчаньне аб веце, б) пасьведчаньне аб узр г) анкета аб соцыяльным і м яльным становішчы паступа завераная профорганамі (в анкет будуць разасланы па чыгуначных мясцкомах і за працы).

Заявы падаваць на імя (б. вакзал—таварная) тэрмін пазьней 31 ліпеня г. г. Усе паючыя павінны будуць пр мэдычны агляд і профадбор, якіх будзе аб'яўлена асобна.



На фото: спаборніцтвы па баскетболу на Усебеларускім стадыёне.

Аб прыёме ў 1930 годзе ў Гомельскі тэхнікум шляхоў зносін

Прыём у тэхнікум будзе праводзіцца на эксплёатацыйнае і цягава-эксплёатацыйнае аддзяленьні.

Паступаючыя падаюць дакуманты: а) анкету, засьведчаную належнымі організацыямі; б) пасьведчаньне аб стажы работы; в) аб узросьце, г) аб адносінах да вайсковай павіннасьці; д) аб адукацыі; е) аб соцыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў; ж) што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых праў; з) дзве фотографічных карткі.

Для асоб, маючых сувязь з сельскай гаспадаркай, неабходна акрамя паказаных дакумантаў прыставіць копію акладнога ліста с. г. падатку за 1929-30 г., засьведчаную РВК-м, альбо Нотарыяльнай Канторай;

У тэхнікум прымаюцца асоб ўзросту немаладзей 16 год больш 21 году, а вытворшчы больш 30 год.

Заявы прымаюцца ў канц Тэхнікуму (Гомель, Коопэрац № 68) штодзённа з 9-ці гад 16 гадз., а з іншага гораду перасылаць поштай з прылаж марак на 20 кап.

У тэхнікум прымаюцца: ра батракі, бедняки, колгасьнікі дзеці, а таксама і ўсе іншыя згодна правіл прыёму ў Тэхн ВНУ апублікаваных Наркомс

На мэдагляд зьявіцца 14-га ня а 10 гадз. раніцы.

Скончыўшыя сямігодкі ў 19 годзе ад іспытаў вызваляюцца пэндыяй і інтэрнатам забя ваюцца ў агульным парадку.

Абгаварваем ліст юнкора Будаўніка

(Увесь матар'ял зьмяшчаецца ў парадку абгаварэньня)

Хто чуе наш голас?

У СВАІМ ЛІСЬЦЕ, ЗЬМЕШЧАНЫМ У „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЕ" АД 19 ЧЭРВЕНЯ ЮНКОР БУДАЎНІК ПЫТАЎСЯ:

Ці пападае ў цэль юнкораўская заметка? Ці ня б'ем мы ў халастую? Чаму несваечасова рэагуюць на юнкораўскія заметкі?

Сёньня мы зьмяшчаем першыя водгукі,—абгаварэньне працягваем—чакаем водгукаў

Баявыя рапарты юнкорау не павінны прападаць дарма

Я вырас на старонках „Чырвонай Зьмены". Мае допісы на яе палёх цяжкім молатам б'юць па ўсім, што стаіць перашкодай у нашай рабоце. Але гэта толькі на старонках газэты, гэта толькі ў радкох і словах, а на справе, у практычнай працы-гэты молат аказваецца тупым, молат б'е толькі 50 проц. шкоднікаў, а астатнія 50 проц. застаюцца траскучымі словамі ў друку.

Я ведаю, што вакол „Чырвонай Зьмены" ўврос вялікі лік юнкораў, якія робяць надзвычайна карысную справу. Праз друк юнкор дапамагае партыі і рабочай клясе змагацца з недахопамі, вучыць вузорам добрай працы. Гэта я ведаю з практыкі. Юнкораўскі рух дае вялікую карысьць, мае надзвычайна вялікае значэньне. **Правідлова ў асноўным ставіць пытаньне тав. Будаўнік, што юнкораўскі допіс часта б'е ў халастую, што на допісы вельмі часта не сваячасова рэагуюць.**

Я думаю, што ня толькі ў аднаго Будаўніка такая думка, якую ён выказвае ў сваім допісе „Хто чуе наш голас".—Такая думка амаль ва ўсіх нашых юнкораў. Аб тым, што на **юнкораўскія допісы глядзяць не як на самакрытыку і дапамогу ў працы, а як на замах на асобу, і вельмі часта імкнуцца зрабіць замах на юнкора**—сьведчаць факты, якіх можна прывесьці сотні толькі з маёй працы, аб чым сваечасова пісалася ў „Чырвонай Зьмене"; а адсюль настойлівае нерэагаваньне на зьмяшчаемыя корэспондэнцыі.

Пры належным рэагаваньні рэдакцыі ўвесь матэр'ял мог-бы даваць карысьць.

Я хачу ўзьняць яшчэ адно ня менш важнае пытаньня—гэта апушчэньне матар'ялу у „доўгі кошык", ці „вечную рэдакцыйную скрынку". Ня гледзячы на пастанову ЦК, супроць такіх зьвішчаў, гэта скрынка ўсе-ж у рэдакцыі ёсьць. Бачна, што яшчэ рэдакцыю заядае бюрократызм, з якім яна вядзе шалёную барацьбу. У сувязі з абгаварэньнем лісту юнкора Будаўніка, уношу прапанову, каб **„Ч. З." утварыла на сваіх старонках куток юнкора**, накшталт „Савецкай Беларусі" і іншых газэт, **дзе-б можна было зьмяшчаць памяткі юнкору і кожны юнкор зьмяшчаў-бы свае думкі аб сваёй працы.**

Правідлова адзначыў Будаўнік аба мне. Справа мая замазана, а націск узмацніўся і дайшоў да таго, што з заводу мяне выжылі. Аб гэтым я паведамляю рэдакцыю асобна.

Рэдакцыі патрэбна перабудавацца, паставіўшы сваю работу так, каб баявыя сыгналы юнкораў не прападалі дарма, каб допіс юнкора крышыў на ўсе 100 проц. нашы недахопы Я спадзяюся, што юнкораўскі актыў мае прапановы падтрымае.

Міхась.

...І я ўпэўніўся, што допісы „мае бязмоцныя"

Пытаньне ўзьнятле юнкорам—Будаўнікам лічу цалкам правільным і абгрунтаваным. У прыклад бяру самога сябе. Пачаў пісаць я ў газэту год таму назад. Працуючы тады на заводзе „Энэргія" ў Менску я ўбачыў ненормальнасьці ў комсамольскім колектыве, гаварыў аб іх з кіраўнікамі каляктыву—не дапамагло. Парашыў зайсьці ў рэдакцыю, там пагутарыў па душах. У рэдакцыі мне параілі пісаць аб усім у газэту. Напісаў допісы „Дзе энэргія энэргаўцаў", „Кожны год у дзень сьвяты", у якіх выкрываў бясчынствы, ненормальнасьці, балячкі комсамольскага колектыву „Энэргіі" і рабочай моладзі заводу. Пісаў аб промфінпляне, аб соц. спаборніцтве і наогул закранаў усё-тое, што было ў загоне.

Чакаў многага, а... атрымаў мала

Сачыў штодзённа, як допісы апраўдваюць сваё прызначэньне: ці зьмяняе сваё аблічча комсамольскі колектыў? Але дарэмна. Усё ішло па старынцы, бяз зьмен. Прайшло пару месяцаў. Зайшоў у рэдакцыю, мяне надбазёрылі:—„Узгрэем, перададзім колектыў „Энэргіі" на РК комсамолу „вынікі будуць". Рэдакцыя запытала колектыў „Энэргіі", які пасьля двух з паловай месяцаў пасьля запытаньня рэдакцыі адказаў, што пытаньне пра становішча колектыву паставілі на сход комсамольцаў Прайшло 6 месяцаў і аб такіх „дробязах„ у нас на сходах не абгаварвалася. У цэху як і раней былі бясчынствы, соцспаборніцтва ня было разгорнута. ня былі арганізаваны ўдарныя брыгады, комуны, завод меў прарывы. Заводзкі трохкутнік спаў, прапановы і мерапрыемствы рабочых па ліквідацыі прарыву прымаліся за глупства. Тут я ўбачыў, што допісы мае бязмоцныя.

Чуць было ня кінуў пісаць

Паехаў працаваць у Гомель на завод „Пролетары". Ня пісаў каля 2-х месяцаў, пакуль не атрымаў ліста з напамінкам аб дасылцы матар'ялу. Тады напісаў падрабязны артыкул аб жыцьці Гомельскіх „пролетарцаў", як выконваецца прамфінплян, соцспаборніцтва, брыгады-комун і г. д. І... артыкул „соизволили" зьмясьціць праз месяц калі ня больш. З падрабязнага артыкулу зрабілі 10-радковы допіс, які ні аб чым не гаварыў.

Паўстае пытаньне, чаму-ж сама рэдакцыя замазвае маючыяся бясчынствы і ненормальнасьці?.. Чаму ня быў зьмешчан допіс, як падрыхтоўваюцца кадры ў Гомельскай профшколе мэталістых? Чаму ня друкуюцца допісы юнкораў—„з правінцыі"?..

У шмат якіх юнкорау адпадае ахвота пісаць. Хаця-б адказалі, што артыкул не падыходзіць ці што інш.,—але гэтага няма.

Думка шмат якіх юнкораў такая, што „Чырвонка" згубіла сваё аблічча. газэта Цэнтральнага Органу комсамолу Беларусі ператварылася ў газ. чыста „свойскую" Менскую. Допісы, юнкораў якія знаходзяцца на вялікай адлегласьці ня друкуюцца. Рэдакцыя запрашвае тэрмінова пісаць па таму ці іншаму пытаньню, а потым гэтыя тэрміновыя допісы ляжаць па месяцу ў чарзе, чакаючы спэцыяльнай старонкі па тэй ці іншай тэме. Гэта няправільна! Допісы павінны зьмяшчацца не чакаючы спэцыяльных чарговых старонак, допіс павінен вараз-жа зьмяшчацца ў дзень атрыманьня.

Мікіта.

Паштовая скрынка

Б. Раскінду,—„Ячэйка сьпіць, райком маўчыць", **А. Сладзіну**—„Аб ячэйцы", **Карнейчыку В.** —„Хто разбудзіць", **Шынкарыку Міколу**—„Прапуюць па ўдарнаму", **Тулімовіч**—„Самаправерка заканчваецца", **Фрыду**—„Сарвалі самаправерку", **Тутэйшаму**—„Самаправерка пачалася", **Юнкору**—„Папяровая ячэйка", **Каліне** — „Самаправерка ў разгары", „Ня ведаюць аб самаправерцы" і „Ня ведаюць аб праверцы самакіраўніцтва",—допісы па свайму зьместу, ня маюць для газэты каштоўнасьці і за недахопам месца друкаваць іх не мэтазгодна. Выкарыстайце лепш у насьценгазэтах, альбо аб закранаемых у допісах пытаньнях, пагаварыце на сходах ячэек.

Босько — „Сваю падрыхтаванасьць выявілі", **Собалю**—„Сыгналы засталіся няўлічанымі", **Вожыку**—„Політ-бой на носу", **Комсамольцу**—„Політбой прайшоў добра", **Пратасееву**—„Праверачная праца політвучобы", КСМ прайшла пры актыўным удзеле", **Мюллер**—„Аб адным політ-бoi", **Жыўчыку**—„Політ-бой у раёне спазьніўся", **Піоарчыку**—„Політ-бой прайшоў здавальняюча", **Клеменку**—„З Парыцкага політ-боя", **знаёмаму комсамольцу**—„Пра політбой зусім забылі", **Кроліну**—„Трэба прачнуцца", **В. С.**—„Як прайшоў політбой", **Шыпількевічу**—„Вынікі політ-вучобы", **Рабкору**—„Ня прыцягваюць, а адштурхваюць"; **Босетку** — „Вынікі комсамольскіх ячэек на палі **Д. Ле-ні**—Аб політ-бoi", **Вожык** вінават", **Ганг**—„Політ-бой пра **Юнкор Я. Я.**—„Політ-бой заўтр пісы надрукованы ня будуць, літ-баек пісаць позна.

Вішні—„Сыгналы ня ўлічаны" **оні**—„Райком пад-час сьпіць", **рыку**—„Самаправерку на рэйк борніцтва", **Каралю**—„За ударн ліся па ўдарнаму", **Стэрліну**—чыцкая ячэйка на перавыбарах **дзіловіч**—„Перавыбары бюро у шаць працу ячэйкі", **Пузіноўскі** вые з-заду мас", **Лагуку**—„Ня вога кіраўніцтва", **Дынге**—зьнішчыць недахопы„, **Федар** „Тварам да колгасу", **Г. Л.**—„Д праца комсамольскай ячэйкі", „Сапраўднага пераломy яшчэ **Клебанаву**—„Заканчваюцца пер ры бюро", **Аўтару дооісу** „ зрух", **Кукушкін**—„Самаправер Вітанапольскай ячэйцы", **Фры** самаправерцы", **Каўзелю**—„С верка у Будзенскай ячэйцы", на—„Прыкладная ячэйка" **Кан** „Самаправерка пройдзена на чынам", **Ударніку**—„АПО ячэ працуе" — пералічаныя допіс друкованы ня будуць, частка з пісана агульна, а рэшта ас менш важныя факты і да дру падыходзяць.

Сёньня а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні АК ЛКСМБ

АДБУДЗЕЦЦА НАРАДА

павадыроў і памоцнікаў піонэр-атрадаў г. Менску.

Мен. АБДКА.

21-га ліпеня а 8-ай гадзіне ўвечары

Ў ПАМЯШКАНЬНІ ПРАЎЛЕНЬНЯ МЦРК (Савецкая 43

СКЛІКАЕЦЦА РЭДАКЦЫЯЙ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ

нарада юнкораў і „Л. К" колектыву МЦРК і коопак моладзі па пытаньню аб рабочым забясьпечаньні,

РЭДАКЦЫЯ „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ"

Адказны рэдактар Рэдколе

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 59